**Макарава Алена Аляксандраўна,**
*загадчык кафедры культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін ДУА «Інстытут культуры Беларусі», кандыдат педагагічных навук, дацэнт (г. Мінск, Беларусь)*

## Беларускі фальклор у дзейнасці аматарскіх мастацкіх калектываў Міншчыны

АМАТАРСКАЯ мастацкая творчасць як сацыяльна-культурны феномен з'яўляецца прадметам вывучэння культуралогіі, сацыялогіі, псіхалогіі, педагогікі, мастацтвазнаўства і тэорыі сацыяльна-культурнай дзейнасці. Гэта тлумачыцца тым, што, як з'ява музычнай культуры і пласт народнай мастацкай творчасці, аматарская мастацкая творчасць выступае ў якасці дзейснага фактару сацыякультурнай дынамікі і эфектыўнага сродку праяўлення сацыягенных патрэб асобы і яе этнічнай самабытнасці.

Аматарская мастацкая творчасць у Беларусі — сапраўдная з'ява беларускай мастацкай культуры і адначасова форма праяўлення сацыяльна-культурнай актыўнасці насельніцтва ў сферы мастацтва. Яна ўключае ў сябе: дзіцячую і сямейную мастацкую творчасць, студэнцкую самадзейнасць, мастацкую творчасць аматарскіх калектываў і асобных выканаўцаў, практыку функцыянавання аматарскіх мастацкіх аб'яднанняў і гурткоў па захапленнях, сацыяльна-культурныя ініцыятывы ў галіне мастацкай культуры і інш.

Як спецыяльна арганізаваная дзейнасць па засваенню, стварэнню і распаўсюджванню культурна-эстэтычных каштоўнасцей ва ўмовах вольнага часу аматарская мастацкая творчасць не губляе сваёй надзённасці і актуальнасці. Пацвярджэннем значнай сацыяльнай ролі аматарскіх мастацкіх калектываў і асобных выканаўцаў у культурным жыцці Беларусі з'яўляюцца шматлікія фестывалі, агляды-конкурсы, святы народнага мастацтва.

Практыка сведчыць, што аматарская мастацкая творчасць была і застаецца адной з найбольш актыўных форм мастацкага асэнса-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вання рэчаіснасці. Як кожная з'ява культуры, аматарскае мастацтва — мнагамерны, шматузроўневы сацыяльны арганізм. У розных рэгіёнах краіны існуе шмат такіх мастацкіх фарміраванняў, якія сваёй творчай працай уносяць значны ўклад у нацыянальную культурную скарбонку, садзейнічаюць фарміраванню нацыянальнай культуры праз прапаганду каштоўнасцей гэтай скарбонкі ўсімі даступнымі ёй формамі і метадамі.

Вытокі аматарскай мастацкай творчасці ляжаць у народных звычаях і каляндарных абрадах, грамадскіх формах выкарыстання вольнага часу, звязаных з песеннай, інструментальнай, тэатральнай і вусна-паэтычнай творчасцю, гульнявымі стасункамі, сямейнымі і святочна-абрадавымі традыцыямі.

Нельга не адзначыць, што, узнаўляючы каштоўнасці традыцыйнай беларускай культуры ў сучасных сацыякультурных умовах, аматарская мастацкая творчасць выступае ў якасці самастойнай падсістэмы сацыялізацыі чалавека, сацыяльнага выхавання і адукацыі. Яна з'яўляецца актыўным сродкам самарэалізацыі творчых здольнасцей асобы, яе самапраяўлення і самавызначэння; выступае дзейсным механізмам эстэтычнага развіцця аматараў мастацтва і забяспечвае ім змястоўную арганізацыю вольнага часу.

Звяртаючы ўвагу на ўзнаўленне фальклорных традыцый у аматарскай творчасці, неабходна падкрэсліць, што аўтэнтычны фальклор (як від традыцыйнай мастацкай культуры існуе ў вясковым асяроддзі і перадаецца з пакалення ў пакаленне вербальна) выяўляецца праз яго носьбітаў. Так, на мяжы XX — XXI стст. у Беларусі быў праведзены шэраг фальклорных фестываляў: рэспубліканскія фестывалі беларускага народнага танца «Беларуская полька» (1993, 1994, 1996, 2000), «Палескі карагод» (1991, 1994, 1997, 2000, 2004), «Пярэзвы» (1992); міжнародны фестываль фальклору (1994); рэгіянальныя фестывалі аўтэнтычнага фальклору Беларускага Падняпроўя (1996); фестываль фальклорнага мастацтва «Берагіня» (2000, 2002, 2004) [2].

Мэтамі гэтых фестываляў былі адраджэнне і падтрымка традыцыйных форм народнай культуры, стымуляванне развіцця

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аматарскага мастацтва, арыентаванага на захаванне фальклорных традыцый у сучасных формах культуратворчай дзейнасці.

Цэнтральная Беларусь займае асноўную частку сучаснай Мінскай і заходнюю ўскраіну Магілёўскай абласцей — Белай Русі, Літвы (Чорнай Русі) і Палесся. Як рэгіянальны варыянт народнай культуры Цэнтральная Беларусь вызначылася ў адносна позні гістарычны час (XVII — XIX стст.). Разам з тым яна адыграла адметную ролю ў працэсе фарміравання беларускага этнасу і яго культуры. Мясцовы этнакультурны ландшафт увабраў у сабе шматлікія элементы і рысы, уласцівыя амаль усім беларускім рэгіёнам.

Гэта выразна назіраецца ў песеннай практыцы, якая ўяўляе перапляценне паўночных, паўднёвых, усходніх і заходніх традыцый. Цэнтральная Беларусь тым і цікавая, што дае магчымасць назіраць працэсы «перацякання» адной традыцыі ў другую і, як вынік, утварэння ў месцах іх перакрыжаванняў арыгінальных версій і варыянтаў тыповых каляндарных і сямейна-абрадавых напеваў, а таксама спосабу і манеры іх выканання, што і характарызуе спецыфіку мясцовай песеннай культуры. Досыць змешаны характар мае ў Цэнтральным рэгіёне Беларусі і харэаграфія. Тут можна сустрэць многія з традыцыйных танцаў, якія бытуюць у іншых рэгіёнах [1, *14*].

Даследаванні, якія праводзіліся намі ў складзе групы супрацоўнікаў установы культуры «Мінскі абласны цэнтр народнай творчасці» на працягу 15 гадоў на Міншчыне (22 раёны), дазваляюць сцвярджаць: вяртанне да традыцый — адзін з найбольш актыўных сацыяльна-культурных працэсаў, што адбываецца зараз у аматарскай мастацкай творчасці.

Творчыя намаганні аматарскіх мастацкіх калектываў Міншчыны характарызуюцца, у першую чаргу, зваротам да традыцыйнай мастацкай культуры. Так, аналіз практыкі функцыянавання калектываў Мінскай вобласці дае падставу меркаваць, што рух аматарскай творчасці — асаблівая і вельмі цікавая з'ява беларускай культуры. Ён адчувае на сабе сацыяльна-гістарычныя ўплывы, якія перажываў беларускі народ на розных этапах сваёй гісторыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З'яўляючыся па сутнасці працягам масавай аматарскай самадзейнасці савецкага часу, сучасная аматарская творчасць уабрала ў сябе ўнікальную беларускую ментальнасць і працягвае дэманстраваць уласцівыя для нашага народа талент і жыццялюбства. Набывае асаблівы сэнс і культуралагічную каштоўнасць зварот да вытокаў нацыянальнай культуры і адраджэнне ў сучасным культурным жыцці фальклорных узораў народнай творчасці.

Так, на Міншчыне дзейнічае каля 200 фальклорных калектываў (практычна ў кожнай трэцяй клубнай установе), з іх 90 — дзіцячыя.

Неабходна падкрэсліць, што катэгорыя пераемнасці з'яўляецца асноўнай у дачыненні да праяў традыцыйнай культуры. Так, у мэтах забеспячэння пераемнасці духоўных і мастацкіх традыцый упраўленнем культуры і ўпраўленнем адукацыі Мінскага аблвыканкама была распрацавана абласная праграма «Традыцыйная культура і дзеці» на 2006—2010 гг. За час дзеяння праграмы ўстановамі культуры Міншчыны быў назапашаны каштоўны вопыт у далучэнні дзяцей і падлеткаў да засваення традыцыйнай мастацкай творчасці беларусаў. Супрацоўнікі клубных устаноў выкарыстоўвалі такія формы працы, як правядзенне фальклорных абрадавых свят, тэатралізаваных прадстаўленняў, выставак народных промыслаў і рамёстваў, сустрэч з майстрамі, конкурсаў, вечарын, гульнёва-забаўляльных праграм, народных гулянняў, кірмашоў. У працэсе рэалізацыі праграмы вялася работа па стварэнню дзіцячых фальклорных калектываў. Каля 1500 дзяцей засвойваюць народныя танцы, гульні, звычаі, знаёмяцца са святамі і абрадамі родных мясцін.

Відавочна, што менавіта сельскія аматарскія калектывы, узнаўляючы каштоўнасці традыцыйнай культуры ў сучасных сацыякультурных умовах, садзейнічаюць мэтам сацыялізацыі асобы, яе сацыяльнаму выхаванню, абапіраючыся на традыцыі беларускага этнасу, што «набыў свае асаблівасці, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне і існуюць у такіх адносна ўстойлівых формах, як мова, традыцыі, абрады, народная творчасць, этнічная самасвядомасць, тапаніміка, культура, лад паўсядзённага жыцця і г. д.» [6].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Так, за значны ўклад у прапаганду народнага мастацтва Беларусі, актыўную канцэртную дзейнасць фальклорны ансамбль «Крупіцкія музыкі» ўзнагароджаны спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у намінацыі «Аматарская мастацкая творчасць». У 2008 г. лаўрэатам спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва ў намінацыях «Народная творчасць», «Аматарская мастацкая творчасць» стаў народны фальклорны калектыў «Гасцінец» Ракаўскага цэнтра культуры і вольнага часу Мінскай вобласці.

З 1968 г. існуе народны фальклорны ансамбль «Маркаўчанка» Маладзечанскага раёна (мастацкі кіраўнік — Вера Зікунова). Канцэртныя праграмы калектыў будуе пераважна на мясцовым фальклоры, але ўключае песні на словы і музыку мясцовых аўтараў. Хор народнай песні «Сябрына» Цясоўскага сельскага Дома культуры Салігорскага раёна (мастацкі кіраўнік — Таццяна Якуніна) за 35 гадоў існавання неаднаразова пацвердзіў свае права насіць пачэснае званне «народны». Рэпертуар калектыву складаецца з беларускіх народных песень, як папулярных, так і малавядомых шырокай аўдыторыі.

Народны ансамбль беларускай народнай песні «Медуніца» (мастацкі кіраўнік — Алена Губарава) Палаца культуры Беларускага аўтазавода г. Жодзіна дэманструе высокае выканальніцкае майстэрства, цікавы рэпертуар, сувязь з фальклорнымі крыніцамі. Традыцыі музычнай сямейнай творчасці беражліва захоўвае народны ансамбль сям'і Бойка Гаўрыліцкага сельскага Дома культуры Салігорскага раёна, у якім прадстаўлена некалькі пакаленняў музыкантаў-аматараў. Стабільным поспехам у гледачоў карыстаецца самабытны ўзорны ансамбль народнай музыкі і песні дзіцячай школы мастацтваў в. Аношкі Нясвіжскага раёна. Народны ансамбль народнай музыкі «Спадчына» Дзяржынскага гарадскога Дома культуры (мастацкі кіраўнік — Віталь Клімакоў) — гэта заўсёды свята музыкі. Сапраўды ва ўмелых і таленавітых руках народных музыкантаў ажываюць галасы самых розных старажытных і сучасных інструментаў: ліры, цымбалаў, жалейкі, скрыпкі, кантрабаса і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Істотным вынікам дзейнасці ўстаноў культуры вобласці з'яўляецца шырокае ўкараненне ў побыт насельніцтва сістэмы традыцыйных свят, абрадаў і рытуалаў на базе фальклорнай спадчыны. Некаторыя ўнікальныя старажытныя абрады з'яўляюцца візітоўкай пэўных арэалаў Міншчыны і падлягаюць ахове і захаванню. Так, на Міншчыне існуе 5 аб'ектаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якім нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці: абрад «Калядныя цары» в. Семежава Капыльскага раёна (у 2009 г. быў унесены ў Спіс Сусветнай нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА рашэннем 4-й сесіі Міжурадавага камітэта ЮНЕСКА па захаванню культурнай спадчыны, што праходзіла з 28 верасня па 2 кастрычніка 2009 г.); абрад «Шчодрык» в. Рог Салігорскага раёна; спеўная манера выканання фальклорных калектываў вёсак Закальное, Обчын, Ямінск Любанскага раёна.

Вялікае значэнне для стварэння тэарэтычнага падмурка для функцыянавання аматарскіх калектываў, арыентаваных на фальклорныя традыцыі, а таксама фестывальнай дзейнасці ў гэтым кірунку мела далучэнне спецыялістаў з практычным вопытам і ведамі, дзякуючы якім на новым узроўні адбываюцца асэнсаванне і прафесійнае вывучэнне нацыянальных фальклорных традыцый, узнаўленне іх у сучаснай фестывальнай практыцы. Дзякуючы намаганням такіх вядомых беларускіх даследчыкаў, як Т. Варфаламеева, М. Дрынеўскі, М. Козенка, В. Ліцвінка і інш., фестывалі фальклору набылі навуковы характар і рэалізуюцца ў форме комплексных доўгатэрміновых праграм.

Сумесна з тагачасным Беларускім дзяржаўным інстытутам праблем культуры і адпаведнымі інстытутамі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў 2006—2009 гг. праводзілася даследаванне па тэме «Сучасны стан традыцыйнай мастацкай культуры Міншчыны», вынікам якога будзе запланаванае на 2010—2011 гг. выданне «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. Цэнтральная Беларусь» (5-ы том шасцітомнай серыі ў 2-х кнігах).

Арыентацыя на захаванне культурных каштоўнасцей традыцыйнай культуры, якая існуе ў дзейнасці аматарскіх калектываў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вобласці, выклікае разам з тым неабходнасць больш дакладнага навуковага асэнсавання аўтэнтычных форм традыцыйнай мастацкай культуры і беражлівых адносін да праяў народнай культуры з боку кіраўнікоў мастацкіх калектываў. У прыватнасці, дзейнасць некаторых фальклорных калектываў, якія маюць ганаровае званне «народны» і «ўзорны», у большай ступені адлюстроўвае растыражаваныя ўзоры беларускай народнай песні і ў меншай ступені спрыяе захаванню мясцовых рэгіянальных этнатрадыцый.

Між тым працэс узнаўлення фальклорных традыцый у дзейнасці большасці канцэртных калектываў мае станоўчыя прыметы. Беларускія народныя песні, найгрышы, інструментальныя творы, заснаваныя на фальклорных традыцыях, прадстаўлены ў канцэртных праграмах практычна кожнага раёна вобласці. Таленавітыя музыканты ўзбагачаюць новымі рысамі традыцыйныя ўзоры беларускай музыкі, захоўваючы пры гэтым іх каларыт і непаўторнасць.

МАЦНТ мэтанакіравана праводзіць аналітычную работу па абагульненню тэндэнцый развіцця традыцыйнай культуры вобласці па розных відах, жанрах, напрамках; падрыхтаваны шэраг аналітычных матэрыялаў, у тым ліку «Аналіз стану традыцыйнай культуры Мінскай вобласці».

Такім чынам, аматарская мастацкая творчасць як спецыяльна арганізаваная дзейнасць па засваенню, стварэнню і распаўсюджванню культурна-эстэтычных каштоўнасцей ва ўмовах вольнага часу не губляе сваёй надзённасці і актуальнасці. Як з'ява беларускай нацыянальнай культуры, сучасная аматарская мастацкая творчасць праз зварот да этнарэгіянальных традыцый і звычаяў беларускага, а таксама і іншых народаў Беларусі набывае новы якасны ўзровень і эстэтычную значнасць.

Выклікае заклапочанасць той факт, што практыка развіцця аматарскай мастацкай творчасці, якая апераджальна расце ў апошнія дзесяцігоддзі, недастаткова актыўна асэнсоўваецца з боку гісторыкаў, культуролагаў, сацыёлагаў, эканамістаў. Да найбольш актуальных задач сённяшняга дня неабходна аднесці даследаванне законаў функцыянавання сацыякультурнай сферы, асэнсаванне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навуковага і практычнага вопыту папярэдніх гістарычных перыядаў.

Можнаканстатаваць, што пакуль не атрымалі належнай распрацоўкі навукова-тэарэтычны, культуралагічны, эканамічны, тэхналагічны аспекты дадзенай грамадска-культурнай з'явы. У шэрагу надзённых праблем — своечасовае тэарэтыка-метадалагічнае асэнсаванне пазначанага пласта сацыяльна-культурнай практыкі.

*Літаратура*

1. Першы міжнародны фестываль фальклору : зб. арт. — Мінск, 1994.
2. *Сівурава, Л. П.* Фестывалі фальклорныя / Л. П. Сівурава // Беларускі фальклор : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал. : Г. П. Пашкоў [і інш.]. — Мінск, 2006. — Т. 2 : Лабараторыя традыцыйнага мастацтва. — «Яшчур».
3. *Козенка, М. А.* Аб выніках рэалізацыі Рэспубліканскага эксперыментальнага праекта «Танцавальны фальклор і дзеці» (2001—2003 гг.) / М. А. Козенка // Традыцыйная культура і дзеці. — Вып. 1 : Рэспубліканскі эксперыментальны праект «Танцавальны фальклор і дзеці» / уклад. М. А. Козенка. — Мінск, 2004.
4. *Макарава, А.* Аб шляхах фарміравання фестывальных традыцый у самадзейнай мастацкай творчасці / А. Макарава, Л. Сівурава // Веснік БелІПК за 1998 г. : навук.-метад. зб. — Мінск, 1999.
5. *Боганева, А. М.* Рэкамендацыі па ахове, захаванню, пераемнасці і папулярызацыі беларускага аўтэнтычнага фальклору / А. М. Боганева, Т. Б. Варфаламеева. — Мінск, 2001.
6. *Варфаламеева, Т. Б.* Гэты патаемны свет фальклору / Т. Б. Варфаламеева // Інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы. — Мінск : БелІПК, 1997. — С. 38—43.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ